УДК 37.017.92

# ДУХОЎНА-МАРАЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ І ТРАДЫЦЫІ ЯК ФАКТАР НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

**Алянюк Галіна Анатольеўна**
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце
дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 1
г. Бялынічы імя М.І. Пашкоўскага»

*У дадзенай рабоце ўздымаецца праблема духоўнасці і маральнасці выхавання асобы сродкамі нацыянальных традыцыйных каштоўнасцей з мэтай забеспячэння нацыянальнай бяспекі нашай краіны.*

Жыццё сучаснага чалавека праходзіць у складаных умовах тэхналагічнага прагрэсу, эканамічнага крызісу, праблем і супярэчнасцей духоўна-маральнага стану грамадства, зніжэння да крытычнага ўзроўню патрыятызму сярод моладзі, адсутнасці канкрэтнай нацыянальнай ідэі, напружанай геапалітычнай сітуацыі. У нашай сённяшняй рэаліі маюць месца антымаральныя праявы, якія вядуць да дэстабілізацыі ў грамадстве, «згубна ўплываюць на псіхаэмацыянальны баланс асобы як аб'екта духоўнага тэрарызму, груба парушаючы яго жыццёва важныя інтарэсы і правы як чалавека і грамадзяніна. І гэта пры тым, што этычныя прынцыпы прызнання фундаментальных правоў, свабод і годнасці чалавека адносяцца да непарушных агульначалавечых каштоўнасцей» [2, с. 9].

Гэта ўсё можа аказацца вельмі небяспечным для далейшага развіцця грамадства. Важна ўлічваць, што менавіта цяпер трэба прылажыць усе намаганні, каб не страціць веру ў «ствальныя пачаткі жыцця, вярнуць чалавеку яго сапраўдную сутнасць і прызначэнне, скіраваць на шлях духоўнага ўдасканалення і ўзвышэння» [2, с. 10].

На гэтым фоне адбываецца пераацэнка агульначалавечых каштоўнасцей, узмацняецца цікавасць да каранёў, звычаяў і традыцый нашых продкаў. Трэба зазначыць, што неспрыяльныя ўмовы жыцця чалавека, парушэнне геапалітычных зносін, праблемы экалогіі параджаюць у чалавека жаданне знайсці нейкую абарону і падтрымку ў нацыянальна-культурных традыцыях і каштоўнасцях папярэдніх пакаленняў, у гістарычнай памяці, што, у сваю чаргу, дае ўпэўненасць сучаснаму чалавеку ў заўтрашнім дні, робіць псіхалагічна і духоўна моцным.

Як слушна заўважаў расійскі даследчык В. Авяр'янаў, «місія культурнай традыцыі неадрыўная ад бесперапыннай якаснай і асэнсаванай арганізацыі гістарычна дынамічнай сістэмы аднаўлення і развіцця чалавека, сістэмы, якая непазбежна ўключае ў сябе мноства фактараў дыскрэтнасці, страты ранейшых значэнняў, зрухі і мутацыі культурных пластоў і, адпаведна, якая імкнецца мінізаваць і кампенсаваць дзеянне гэтых фактараў» [1, с. 18].

Трэба сказаць, што сучасны чалавек, на жаль, адчувае дэфіцыт сапраўдных этычных адносін, адказнасці за свае ўчынкі, разумення праблем іншых людзей, зычлівасці да слабейшых. Таму зварот да пытанняў духоўна-маральных каштоўнасцей нашых продкаў даволі актуальны і можа рэалізаавацца ў розных накірунках этыка-культурнага выхавання, праз вяртанне каштоўнасцей нацыянальнай гісторыі, культуры і літаратуры, дзе мы знаёмімся з асобамі, якія праз жыццё пранеслі вялікі сэнс маралі жыцця і адказнасці за яго. Каштоўная грамадская думка папярэдніх пакаленняў захавала шмат выдатных прыкладаў глыбокага асэнсавання рэчаіснасці, бачання праблем і пошуку шляхоў іх вырашэння.

Варта адзначыць, што значная адказнасць за маральнае выхаванне і светапогляд падрастаючага пакалення накладваецца на педагогаў устаноў адукацыі, у прыватнасці, класных кіраўнікоў. Той чалавек, каму даверана фарміраванне асобы будучага грамадзяніна сваёй дзяржавы, сам павінен быць прыкладам для пераймання, быць чалавекам зычлівым, суперажывальным, паважаць традыцыі, звычаі продкаў, быць самым сапраўдным грамадзянінам роднай краіны, беражліва адносіцца да набыткаў народа.

Таму ўрочная і пазакласная дзейнасць у школе павінна быць накіравана на выкананне задач духоўна-маральнага выхавання школьнікаў і заключаецца ў засваенні і прымяненні на практыцы ведаў аб прызначэнні чалавека, пра каштоўнасць чалавечага жыцця, у развіцці высокага маральнага і культурнага ўзроўню, у развіцці патрыятызму, у вывучэнні гісторыі свайго народа, яго мінулага і сучаснасці, ва ўсведамленні свайго ўплыву на будучыню Радзімы.

Неабходна зазначыць, што важнае значэнне ў рабоце па духоўна – маральнаму выхаванню навучэнцаў набывае ўзмацненне ўзаемадзеяння паміж школай і бацькамі (асабістыя сямейныя сустрэчы, правядзенне бацькоўскіх сходаў, наведванне музеяў, выстаў, правядзенне спартыўных спаборніцтваў).

У далейшым неабходна ўдасканальваць формы і метады адукацыі і выхавання моладзі, дзе, як піша В.А. Паўлоўская, «павінны злучацца ў адзінае цэлае як агульначалавечыя, так і нацыянальна-культурныя каштоўнасці, пераследуючы пры гэтым галоўную мэту – зрабіць чалавека "чалавечным". У выніку гэтага будзе адбывацца як рэалізацыя гуманістычных ідэалаў у духоўна багатай, маральна дасканалай, высокаадукаванай асобы, так і засваенне нацыянальных культурных дасягненняў, якія садзейнмчаюць фарміраванню чалавека ў якасці годнага грамадзяніна і патрыёта сваёй краіны. А гэта, у сваю чаргу, паспрыяе эфектыўнаму сацыяльна-эканамічнаму развіццю, стабілізацыі сацыяльна-палітычных сувязяў і адносін, забеспячэння нацыянальнай бяспекі» [3, с. 9].

На ўзроўні дзяржавы распрацаваны і прыняты шэраг праграм, накіраваных на падтрымку інстытута сям'і, школы, патрыятычнае, духоўна-маральнае выхаванне, развіццё нацыянальнай культуры.

Асновы маральна-этычнага станаўлення і выхавання асобы закладзены ў аснову Дзяржаўных праграм на 2016–2020 гг. («Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека», «Адукацыя і маладзёжная палітыка», «Культура Беларусі», Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи 2016–2020), дзе адлюстравана каштоўная ідэя, якая павінна дапамагчы пазбегнуць разбурэння афіцыйнай дзяржаўнай ідэалогіі, страты духоўных і этычных ідэалаў, нацыянальнай самаідэнтыфікацыі.

Такім чынам, прыходзім да высновы; каб не дапусціць дэградацыі грамадства, трэба накіраваць грамадскую свядомасць на шкалу духоўных, маральных каштоўнасцей, трэба асэнсаваць той факт, што ў аснове гарманічнага грамадства павінен ляжаць духоўна-маральны пачатак.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Аверьянов, В. В. Традиция как методологическая проблема в отечественной культурологии XX века : автореф. дис. / В. В. Аверьянов. – М., 2012. – 58 с.

2. Максімовіч, В. А. Нацыянальная мастацкая традыцыя ў кантэксце гуманітарнай бяспекі Беларусі / В. А. Максімовіч. – Мінск : Беларуская навука, 2019. – 267 с.

3. Павловская, О. А. Введение: Духовно-нравственные основы безопасности Республики Беларусь / О. А. Павловская // Духовно-нравственные ценности в формировании современного человека / О. А. Павловская [и др.] ; под ред. О. А. Павловской: Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т философии. – Минск : Беларус. навука, 2011. – С. 3–37.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова